Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
______________ Н. У. Карчэўская
«___» _____________ 2018 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СЦЭНАРНА-РЭЖЫСЁРСКІЯ АСНОВЫ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць*

2018

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО 1-23 01 14-2013 і вучэбнага плана па спецыяльнасці 1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць, рэг. № Е23-1-75/17 вуч. ад 04.07.2017


**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*Т. П. Бірукова*, дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*М. У. Камоцкі,* выкладчык кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»;
*В. Ф. Савіна,* дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*Н. С. Пракаповіч,* выкладчык кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»;
*Р. Ф. Маленчанка,* прафесар кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», дацэнт;
*Р. М. Астрадзінава,* старшы выкладчык кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»



**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*Р. Л. Бузук,* загадчык кафедры тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;
*В. М. Румава,* дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь” г. Мінска»

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
кафедрай педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 10 ад 30.05.2017);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 28.06.2017)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Т. П. Бірукова


**ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праграма вучэбнай дысцыпліны «Сцэнарна-рэжысёрскія асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці», якая ўключае тры раздзелы: «Сцэнарнае майстэрства», «Рэжысура культурна-адпачынкавых праграм», «Сцэнічная мова», – пабудавана з улікам сучасных патрабаванняў, што прад'яўляюцца да падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы. Вывучэнне дысцыпліны дапаможа ўзброіць будучых спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы веданнем тэарэтычных асноў, асноўных механізмаў авалодання тэхналагічнымі сістэмамі сцэнарнага і рэжысёрскага майстэрства, а таксама навыкамі і ўменнямі сцэнічнай мовы.

Вучэбная дысцыпліна з'яўляецца базавай у прафесійным цыкле дысцыплін па спецыяльнасці «сацыяльна-культурная дзейнасць». Яе змест прадугледжвае працэс авалодання спецыфікай і асаблівасцямі арганізацыі гульнявых, рэкрэацыйных, інфармацыйна-адукацыйных, святочна-абрадавых, забаўляльных і іншых форм культурна-адпачынкавай дзейнасці.

Засваенне вучэбнай праграмы «Сцэнарна-рэжысёрскія асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці» дапаможа студэнтам забяспечыць фарміраванне шэрага акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый (умець працаваць самастойна; валодаць сцэнарным майстэрствам і спецыфікай пастаноўкі разнастайных культурна-адпачынкавых праграм; быць здольным параджаць новыя ідэі, валодаць крэатыўнасцю; валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі; далучаць розныя групы насельніцтва і асобных індывідаў да пазітыўна накіраваных форм культурна-адпачынкавай дзейнасці; умець працаваць у камандзе).

*Асноўная мэта вучэбнай дысцыпліны* – сфарміраваць у студэнтаў сукупнасць ведаў і практычных навыкаў распрацоўкі сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы, пастаноўкі разнажанравых праграм, навыкаў выканальніцкага майстэрства і культуры мовы.

*Задачы:*

– атрымаць уяўленне:

аб агульных драматургічных паняццях – драматургічным дзеянні і канфлікце як асноўных рысах драмы, архітэктоніцы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

драматычнай калізіі, ідэйна-тэматычнай задуме, сюжэце, кампазіцыйнай пабудове;

аб агульных рэжысёрскіх паняццях – рэжысуры, дзейсным аналізе, канфлікце, сюжэтнай лініі, падзейным радзе, ацэнцы, звышзадачы, вобразным мастацкім вырашэнні;

– вызначыць спецыфіку сцэнарыя культурна-адпачынкавых праграм: спосабы пабудовы дзеяння, прыёмы мантажу, сродкі выразнасці, іх мастацкая апрацоўка і напісанне сцэнарыяў;

– засвоіць асноўныя характарыстыкі жанраў культурна-адпачынкавых праграм і тэатралізаваных прадстаўленняў, кампазіцыйную структуру формы (пралог, эпізоды, фінал), прыёмы мантажу, сродкі выразнасці рэжысёрскага вырашэння. Ажыццявіць пастаноўку тэатралізаванага прадстаўлення;

– авалодаць арфаэпічнымі нормамі літаратурнай мовы (пажадана рускай і беларускай), прынцыпамі выхавання моўнага голасу, уменнем арганічна «жыць» у адабраным сцэнічным матэрыяле.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты *павінны ведаць:*

– тэорыю рэжысуры і асноўныя элементы сцэнарнага майстэрства, узаемасувязь яго з іншымі драматургічнымі відамі;

– класіфікацыю культурна-адпачынкавых праграм і асаблівасці іх сцэнарнай распрацоўкі;

– тэорыю рэжысуры і асноўныя элементы акцёрскага майстэрства; сутнасць і прынцыпы рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм;

– спецыфіку арганізацыі сцэнічнай прасторы і прыроду стварэння творчай атмасферы ў працэсе пастаноўкі тэатралізаванай праграмы;

– методыку працы над літаратурным творам, тэхнікай прамовы і развіццём галасавых здольнасцей; тэорыю і методыку работы над унутранай тэхнікай славеснага дзеяння.

Студэнты *павінны ўмець:*

– абгрунтаваць ідэйна-тэматычную задуму і вобразнае рашэнне будучага сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы;

– адбіраць рознабаковыя сродкі выразнасці і па-мастацку іх апрацоўваць; літаратурна аформіць будучы сцэнарый;

– распрацаваць сцэнарна-рэжысёрскую задуму асобных кампанентаў тэатралізаванага прадстаўлення, яго вобразна-пластычнае рашэнне і рэжысёрскі пастановачны план;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– арганізаваць вучэбна-рэпетыцыйны працэс з выканаўцамі і іншымі ўдзельнікамі творчага калектыву (гукарэжысёрам, загадчыкам пастановачнай часткі, мастаком, балетмайстрам, светааператарам і інш.);

– праводзіць комплексны галасавы трэнінг, выкарыстоўваць моўны голас і моўную выразнасць у сваёй дзейнасці;

– прымяняць веды ў галіне сцэнічнай мовы для выкладчыцкай дзейнасці.

Студэнты павінны *валодаць:*

– тэрміналогіяй і асноўнымі паняццямі дысцыпліны «Сцэнарна-рэжысёрскія асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці»;

– метадамі арганізацыі і правядзення культурна-адпачынкавых праграм;

– тэхналогіямі арганізацыі масавага адпачынку насельніцтва.

Вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сцэнарна-рэжысёрскія асновы сацыяльна-культурнай дзейнасці» ўсяго прадугледжана 1132 гадзіны, у тым ліку 568 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 56 гадзін, лабараторныя – 494 гадзіны, індывідуальныя – 18 гадзін.

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залікі і экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел 1. Сцэнарнае майстэрства

### *Тэма 1. Уводзіны. Характарыстыка драматургічных твораў і спецыфічныя асаблівасці драматургіі культурна-адпачынкавых праграм*

Прадмет і задачы дысцыпліны. Сувязь дысцыпліны з іншымі прадметамі. Характарыстыка тэматычнага плана, форм навучання. Характарыстыка культурна-адпачынкавых праграм, дынаміка іх развіцця. Агляд літаратуры па курсе.

Паняцці «драма», «драматургія», агульныя рысы драматургічных твораў. Канфлікт як асноўная рыса драмы. Развіццё канфлікту. Віды драматургічных твораў: драматургія тэатра, кіно, радыё, тэлебачання, культурна-адпачынкавай праграмы.

Віды культурна-адпачынкавых праграм, іх спецыфічныя асаблівасці. Параўнальная характарыстыка драматургічных твораў (інфармацыйна-дыскусійных, публіцыстычных, відовішчна-забаўляльных, камунікатыўных, конкурсна-забаўляльных). Праблемы распрацоўкі сцэнарыя культурна-адпачынкавых праграм.

### *Тэма 2. Сцэнарый як драматургічная аснова культурна-адпачынкавай праграмы*

Паняцці «сцэнарый», «сцэнарны план». Спецыфічныя асаблівасці сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы. Кампазіцыйная пабудова дзеяння ў сцэнарыі. Спосабы пабудовы. Віды канфліктаў. Тры «эфекты» праграмы (прысутнасць, саўдзел, удзел) і іх узаемадзеянне. Сюжэт сцэнарыя, сюжэтны ход і іх распрацоўка ў эпізодах, блоках. Сінтэтычнасць культурна-адпачынкавай праграмы.

### *Тэма 3. Характарыстыка сродкаў выразнасці сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы*

Віды сродкаў выразнасці ў сцэнарыі культурна-адпачынкавай праграмы (дакументальныя, мастацкія, тэхнічныя, фальклорныя і інш.). Дакументальныя сродкі выразнасці, іх характарыстыка. Выбар рэальнага героя. Паэтычнае і мастацкае слова і іх выкарыстанне ў сцэнарыі. Жанры мастацтва і іх характарыстыка. Прынцыпы адбору сродкаў выразнасці. Прыёмы ак-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тывізацыі аўдыторыі. Асаблівасці фальклорных сродкаў выразнасці. Асноўныя крыніцы адбору матэрыялу.

*Тэма 4. Асноўныя этапы работы*
*над сцэнарыем культурна-адпачынкавай праграмы*

Абгрунтаванне ідэйна-тэматычнай задумы сцэнарыя: праблема, тэма, ідэя, мэта. Адлюстраванне ў задуме асноўных прыкмет драматургічнага твора: канфлікту, сюжэта і кампазіцыі. Кампазіцыйная пабудова сцэнарыя ў адпаведнасці з асноўнымі прынцыпамі драматургіі культурна-адпачынкавай праграмы: логіка развіцця тэмы, нарастанне дзеяння, закончанасць кожнага эпізоду, узаемасувязь усіх частак сцэнарыя праграмы.

Вывучэнне, аналіз і адбор сродкаў выразнасці. Мастацка-музычнае афармленне праграмы. Літаратурны запіс сцэнарыя: сцэнарны план, лібрэта, літаратурны сцэнарый. Бібліяграфія сцэнарыя.

*Тэма 5. Метад тэатралізацыі*
*як аснова стварэння мастацкага вобраза*
*сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы*

Сутнасць паняцця «тэатралізацыя». Функцыі тэатралізацыі. Сродкі тэатралізацыі. Віды тэатралізаваных культурна-адпачынкавых праграм і іх характарыстыка.

*Тэма 6. Метады ілюстравання і інсцэніравання ў сцэнарыі,*
*іх выкарыстанне ў культурна-адпачынкавай праграме*

Віды ілюстрацыі: мастацкая, фатаграфічная, ілюстрацыя-схема, ілюстрацыя-макет, ілюстрацыя-дакумент. Прынцыпы ілюстрацыі: суадносіны ідэйнага зместу з мастацкай формай мерапрыемства; псіхалагічнае абгрунтаванне спалучэння лагічнага і эмацыянальнага пачаткаў у сцэнарыі; комплекснае выкарыстанне мастацка-ілюстрацыйных сродкаў і розных відаў мастацтва.

Бачная песня, верш, апавяданне як формы тэатральнага дзеяння. Інсцэніраванне мастацкага і дакументальнага матэрыялу. Інсцэніраванне рэальнай падзеі як асновы стварэння драматургічнага твора.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 7. Мантаж як творчы метад сцэнарыста: уласцівасці, функцыі*

Віды мантажу: канструктыўны, асацыятыўны. Уласцівасці і функцыі мантажу. Характарыстыка прыёмаў мантажу: кантраснасць, паралелізм, прыём спалучэння, лейтматыў, рэфрэн і інш. Наяўнасць драматургічнага ходу як асновы мантажу і розных сродкаў выразнасці (па сэнсе, прызначэнні, настроі і тэмпарытме). Мантажны ліст сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы.

*Тэма 8. Літаратурны запіс сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы і ажыццяўленне яго аналізу*

Сцэнаграфія праграмы (мастацкае і музычнае афармленне). Кампазіцыя размяшчэння літаратурнага матэрыялу. Бібліяграфія да сцэнарыя. Літаратурнае афармленне сцэнарыя, афармленне праграмы.

Асаблівасці аналізу сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы. Тэхнічныя патрабаванні да афармлення сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы.

*Тэма 9.Асаблівасці правядзення аналізу сцэнарыяў культурна-адпачынкавых праграм разнастайных жанраў*

Аналіз культурна-адпачынкавых праграм разнастайных жанраў (інфармацыйна-дыскусійных, гульнявых, конкурсных, фальклорных, забаўляльных, культурна-відовішчных і інш.).

Прагляд і калектыўнае абмеркаванне сцэнарыяў інфармацыйна-пазнавальных праграм. Аналіз студэнтамі прапанаваных сцэнарыяў па схеме: характарыстыка жанру праграмы; ідэйна-тэматычная задума; кампазіцыйная пабудова задумы; від канфлікту; наяўнасць сцэнарна-рэжысёрскага ходу; прыёмы актывізацыі аўдыторыі; выкарыстанне сродкаў выразнасці.

*Тэма 10. Рэальны герой і яго прадстаўленне*

Выбар студэнтам рэальнага героя для яго прадстаўлення ў межах канкрэтнай культурна-адпачынкавай праграмы. Знаёмства з біяграфічнымі данымі абранага рэальнага героя, падбор неабходнага фактаграфічнага матэрыялу аб яго творчым, прафесійным, жыццёвым шляху.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На аснове атрыманых звестак студэнт распрацоўвае сцэнарны варыянт яго прадстаўлення па схеме: знаёмства рэальнага героя з гледачамі, інтэрв’ю з рэальным героем (5–6 пытанняў з меркаванымі адказамі), заключная частка (рэзюмэ).

Прадстаўленне студэнтамі сваіх сцэнарных распрацовак па знаёмстве з рэальным героем. Калектыўнае абмеркаванне і аналіз сцэнарных распрацовак студэнтаў з прадстаўленнем рэальнага героя.

*Тэма 11. Літаратурная замалёўка*
*і яе сцэнарная распрацоўка*

Вызначэнне студэнтам ідэйна-тэматычнай задумы будучага літаратурнага эцюда, у аснове якога канфліктны факт, жыццё чалавека, падзея і інш. Літаратурнае апісанне студэнтам гэтай падзеі так, каб быў ярка раскрыты канфлікт.

Студэнт адбірае розныя сродкі выразнасці (дакументальныя, мастацкія і інш.) і распрацоўвае кампазіцыйную пабудову дзеяння літаратурнай замалёўкі.

Прадстаўленне студэнтамі закончаных сцэнарных распрацовак літаратурных замалёвак.Калектыўнае абмеркаванне і аналіз сцэнарных распрацовак студэнтаў.

*Тэма 12. Выбар рэальнай падзеі і яе сцэнарная распрацоўка*

Выбар студэнтам з газет, часопісаў, інтэрнэт-парталаў рэальнай падзеі з канфліктнай асновай. Распрацоўка ідэйна-тэматычнай задумы, вызначэнне жанру і мэтавай аўдыторыі будучага самастойнага блока культурна-адпачынкавай праграмы.

Вывучэнне і адбор розных сродкаў выразнасці і прыёмаў актывізацыі аўдыторыі для ажыццяўлення сцэнарнай распрацоўкі рэальнай падзеі.

Прадстаўленне студэнтамі блока сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы.

*Тэма 13. Прагляд і асаблівасці рэцэнзавання*
*разнастайных культурна-адпачынкавых праграм*

Этапы рэцэнзавання культурна-адпачынкавых праграм. Прагляд культурна-адпачынкавых праграм розных жанраў. Калектыўнае абмеркаванне прагледжаных праграм.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Самастойнае рэцэнзаванне студэнтамі прагледжаных культурна-забаўляльных праграм па прапанаванай схеме.

*Тэма 14. Фарміраванне ідэйна-тэматычнай задумы і распрацоўка асноўных кампанентаў групавога сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы*

Абмеркаванне студэнтамі ў падгрупах ідэйна-тэматычнай задумы будучага сцэнарыя, вызначэнне жанру і аўдыторыі культурна-адпачынкавай праграмы.

Студэнты фармулююць сцэнарна-рэжысёрскі ход будучага сцэнарыя (вобразна-гульнявы, дэкаратыўна-вобразны і вобразна-музычны).Падгрупы студэнтаў прадстаўляюць ідэйна-тэматычныя задумы будучых сцэнарыяў на калектыўнае абмеркаванне.

Студэнты ў падгрупах даюць характарыстыку ўсім часткам сцэнарыя, якія складаюць яго кампазіцыйную структуру.

*Тэма 15. Вывучэнне, адбор і выкарыстанне сродкаў выразнасці і прыёмаў актывізацыі аўдыторыі для раскрыцця задумы сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы*

Студэнты ў падгрупах вывучаюць, аналізуюць і адбіраюць разнастайныя сродкі выразнасці (дакументальныя, мастацкія, гульнявыя, фальклорныя і інш.) для раскрыцця ідэйна-тэматычнай задумы сцэнарыя. Выкарыстоўваючы мастацкі і дакументальны матэрыял, студэнты распрацоўваюць сюжэтную пабудову дзеяння ў сцэнарыі.

Студэнты далучаюць у сцэнарый метады тэатралізацыі, ілюстрацыі і інсцэніравання, а таксама інтэгруюць разнастайныя прыёмы актывізацыі аўдыторыі (гульнявыя, мастацкія, журналісцкія, рэжысёрскія) у сцэнарый культурна-адпачынкавай праграмы.

*Тэма 16. Мантаж матэрыялу і літаратурны запіс групавога сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы*

Студэнты складаюць літаратурны тэкст сцэнарыя, падначалены ўсім законам кампазіцыйнай пабудовы і ідэйна-тэматычнай задумы, рэалізуючы ў сцэнарыі асноўныя прыёмы мантажу: кантраснасць, паралельнасць, адначасовасць, лейтматыў, паслядоўнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аб’яднанне студэнтамі распрацаваных блокаў у агульны сцэнарый. Студэнтамі ажыццяўляецца запіс сцэнарыя ў адпаведнасці з тэхнічнымі патрабаваннямі да літаратурнага афармлення сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы. Рэдагаванне гатовага сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы.

Правядзенне падрабязнага драматургічнага аналізу гатовых сцэнарыяў.

*Тэма 17. Тэхналагічныя асновы распрацоўкі аўтарскага сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы*

Аналіз асноўных жанраў культурна-адпачынкавых праграм (інфармацыйна-дыскусійныя, конкурсна-забаўляльныя, відовішчныя, камунікатыўныя, святочна-абрадавыя і інш.).

Студэнты знаёмяцца з асаблівасцямі і спецыфікай драматургічнай асновы розных жанраў культурна-адпачынкавых праграм і ажыццяўляюць выбар жанру для распрацоўкі аўтарскага сцэнарыя.

*Тэма 18. Фарміраванне ідэйна-тэматычнай задумы і кампазіцыйная пабудова аўтарскага сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы*

Фарміраванне ідэйна-тэматычнай асновы аўтарскага сцэнарыя (тэма, ідэя, мэта), распрацоўка сцэнарнага плана, асобных эпізодаў, характарыстыка і вызначэнне сцэнарна-рэжысёрскага ходу будучага сцэнарыя.

Студэнты характарызуюць усе часткі будучага сцэнарыя, якія складаюць яго кампазіцыйную структуру.

*Тэма 19. Адбор сродкаў выразнасці, выкарыстанне прыёмаў актывізацыі аўдыторыі, мантаж і літаратурнызапіс аўтарскага сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы*

Студэнты вывучаюць і адбіраюць разнастайныя сродкі выразнасці (дакументальныя, мастацкія, гульнявыя, фальклорныя і інш.), якія неабходна выкарыстоўваць у аўтарскім сцэнарыі.

Студэнты манціруюць разнастайны матэрыял, улічваючы асаблівасці дадзенага метаду.

Ажыццяўленне студэнтамі літаратурнага запісу аўтарскага сцэнарыя ў адпаведнасці з тэхнічнымі патрабаваннямі да афармлення сцэнарыя культурна-адпачынкавых праграм.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Студэнт распрацоўвае макет наглядна-мастацкага афармлення праграмы (афіша, запрашальны білет, эскізы афармлення, эмблема і г. д.) і афармляе спіс літаратуры.

*Тэма 20. Падрыхтоўка аўтарскага сцэнарыя культурна-адпачынкавай праграмы да публічнай абароны*

Студэнт ажыццяўляе рэдагаванне канчатковага варыянта аўтарскага сцэнарыя і афармляе яго ў індывідуальную папку з дадаткам электроннага варыянта.

Студэнт рыхтуе мультымедыйную прэзентацыю да публічнай абароны аўтарскага сцэнарыя.

## Раздзел 2. Рэжысура культурна-адпачынкавых праграм

*Тэма 1. Уводзіны. Паняцце аб рэжысуры. Асаблівасці рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм і тэатралізаваных прадстаўленняў. Функцыі рэжысёра*

Асноўныя прынцыпы тэатра і іх выкарыстанне ў рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм і тэатралізаваных прадстаўленняў. Рэжысёрскія прафесійныя здольнасці. У. І. Неміровіч-Данчанка аб функцыях рэжысёра: рэжысёр-тлумачальнік, рэжысёр-педагог, рэжысёр-арганізатар творчага працэсу.

Асаблівасці рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм і тэатралізаваных прадстаўленняў. Агульнае і спецыфічнае ў рэжысуры драмы і рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм. Разнастайнасць форм, метадаў і выразных сродкаў у рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм і тэатралізаваных прадстаўленняў. Сістэма К. С. Станіслаўскага як школа выхавання акцёра і рэжысёра, як аснова рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм і тэатралізаваных прадстаўленняў. Метад дзейснага аналізу К. С. Станіслаўскага ў рабоце рэжысёра культурна-адпачынкавых праграм. Тэатралізацыя як галоўны метад у рэжысуры культурна-адпачынкавых праграм. Методыка арганізацыі калектыўна-індывідуальнай творчасці ў рабоце рэжысёра з выканаўцамі КАП і тэатралізаваных прадстаўленняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 2. Сцэнічнае дзеянне як аснова творчасці. Элементы сцэнічнага дзеяння. Псіхафізічнае дзеянне акцёра. Выканаўчы трэнінг і яго значэнне для авалодвання сцэнічным дзеяннем*

К. С. Станіслаўскі аб выхаванні акцёрскага майстэрства. Прынцыпы выхавання творчай асобы акцёра. Асноўныя напрамкі ў акцёрскім мастацтве. Дзеянне – аснова сцэнічнага мастацтва акцёра. Асноўныя задачы выканаўчага трэнінгу ў вобразе на сцэне. Элементы сцэнічнага дзеяння.

Сістэма выхавання акцёра і рэжысёра школы К. С. Станіслаўскага і яе асноўныя прынцыпы. Стварэнне спрыяльных умоў для творчасці. Выхаванне ўнутранай і знешняй тэхнікі акцёра. Элементы творчага складання (адчуванне акцёра і правільнага сцэнічнага самаадчування).

Сцэнічнае дзеянне як матэрыял акцёрскага мастацтва. Прыметы дзеяння. Метад фізічных дзеянняў Станіслаўскага. Слоўнае дзеянне. Логіка і вобразнасць мовы, тэкст і падтэкст. Сцэнічная задача і яе элементы.

*Тэма 3. Стварэнне эцюдаў на арганічнае маўчанне на аснове жыццёвых назіранняў: адзіночнага, парнага, масавага*

Жыццёвыя назіранні як матэрыял для стварэння эцюдаў на арганічнае маўчанне. Стварэнне эцюдаў на аснове практыкаванняў, падзея ў адзіночным эцюдзе на беспрадметнае дзеянне («я» ў прапанаваных абставінах). Эцюды на веру і наіўнасць, эмацыянальную памяць, логіку і паслядоўнасць паводзін на сцэне. Эцюды на зносіны: парныя і групавыя. Зносіны як адносіны да аб’екта ўвагі, бесперапыннасць узаемадзеяння партнёраў, умовы зносін. Асноўныя элементы зносін. Прыстасаванні – спосабы прыстасавання і зносін. Унутраныя маналогі і іх значэнне на працягу зносін. Парны эцюд на зносіны ва ўмовах арганічнага апраўданага маўчання.

Задума парнага, групавога і масавага эцюдаў, пабудова ў ім падзеі. Сюжэт эцюда. Пабудова канфлікту барацьбы дзеючых асоб за сваё меркаванне. Характарыстыка дзеючых асоб. Музыка як спосаб арганізацыі дзеяння. Вобразнасць эцюда. Арганізацыя сцэнічнай прасторы для арганічных паводзін акцёра на сцэне ў эцюдзе.

Літаратурны запіс створаных эцюдаў, іх ідэйна-тэматычны аналіз і ўвасабленне.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 4. Асаблівасці работы рэжысёра над нумарам як часткай культурна-адпачынкавай праграмы і тэатралізаванага прадстаўлення*

Сцэнарная рэжысёрская распрацоўка нумара.

Асаблівасці работы рэжысёра над нумарам на аснове літаратурнага твора: верша, песні, байкі, казкі. Крытэрыі адбору мастацкага матэрыялу для інсцэніроўкі нумара.

Агульныя прынцыпы і законы інсцэніравання: замена апісальнага раду зрокавым, знаходжанне драматычнага і духоўнага эквіваленту твора, сугучнасць грамадскай пазіцыі аўтара з пазіцыяй рэжысёра, захаванне сюжэтнай і кампазіцыйнай пабудовы, жанравай прыналежнасці твора, стварэнне паралельнага рада, перадача апісальных момантаў з дапамогай тэатральных выразных сродкаў (акцёр, яго лінія дзеянняў, унутраных маналогаў, падтэкстаў, дэкарацый, бутафорыі, сэнсавых акцэнтаў, музычнага, шумавога, светлавога і іншых сродкаў тэхнічнай выразнасці).

Прыём «зримой песни» ў рэжысуры Г. А.Таўстаногава. Вобразнае сцэнічнае рашэнне бачнай песні.

Этапы работы :

– вызначэнне звышзадачы рэжысёра, сугучнай аўтарскай ідэі;

– вызначэнне прапанаваных абставін, лініі дзеяння і процідзеяння галоўнага канфлікту, эмацыянальных адносін да дзеючых асоб і іх учынкаў, пабудова дзеяння адпаведна падзейнага рада;

– вызначэнне жанру, выбудоўванне асацыятыўнага рада і знаходжанне вобразнага строю думкі тэатралізаванай песні.

Тэатралізацыя песні як адно са сродкаў выражэння рэжысёрскай звышзадачы.

Асаблівасці прыёмаў тэатралізацыі бачнай песні. Агульнасць і адрозненне прыёмаў тэатралізацыі верша і песні. Разгорнутая інсцэніроўка падзеі песні праз комплекс выразных сродкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 5. Рэжысёрская задума нумара.*
*Ідэйна-тэматычны аналіз літаратурнага матэрыялу*

Паняцце «мастацкая задума твора». Рэжысёрская задума нумара. Арганізацыйнае значэнне рэжысёрскай задумы ў творчым працэсе.

Асацыятыўныя вобразы як элементы рэжысёрскай задумы. Фарміраванне рэжысёрскага назірання і яго фіксацыя. Этапы распрацоўкі задумы нумара: рэжысёрскі аналіз твора і задума яго пастаноўкі. Рэжысёрская задума нумара.

*Тэма 6. Рэжысёрскае рашэнне нумара як часткі культурна-адпачынкавай праграмы. Пошук вобразных выразных сродкаў*

Распрацоўка рэжысёрскага рашэння нумара. Стварэнне рэжысёрскага сцэнарыя на аснове ідэйна-тэматычнага аналізу і задумы твора. Увасабленне рэжысёрскай задумы. Пошук вобразнага,ідовішчнага рашэння нумара.

Пабудова кампазіцыі як аднаго з выразных сродкаў. Улік неразрыўнай узаемасувязі кампазіцыі і звышзадачы, падзейнага рада, рэжысёрскіх акцэнтаў і кампазіцыі.

Узаемасувязь і залежнасць тэмпарытму і вобразнага рашэння.

Мізансцэна як выразны сродак рэжысуры. Сцэнічны буйны план. Сцэнічныя планы і вышыня. Мізансцэніраванне і сцэнічная пляцоўка, рэльеф. Мізансцэна рэакцый. Сувязь бачнага і гукавога рада. Часовае і прасторавае пачуццё рытму і іх значэнне ў пабудове мізансцэны. Правілы апраўдвання мізансцэны за мяжой прасторы куліс. Мізансцэны натоўпу. Прыём фрагментацыі. Мізансцэна-маналог. Мізансцэна-поза. Сэнсавая нагрузка стоп-кадра. Віды мізансцэн. Пошук вобразнага відовішчнага рашэння нумара праз іншасказальныя сродкі выразнасці (метафара, сімвал, алегорыя), праз мастацкія, музычныя, пластычныя, каляровыя, шумавыя мультымедыйныя сродкі выразнасці.

*Тэма 7. Работа рэжысёра з выканаўцамі*
*над стварэннем мастацкага вобраза ў нумары*

Прынцыпы выхавання акцёраў. Творчасць акцёра як асноўны матэрыял рэжысёрскага мастацтва. Задачы рэжысёра ў рабоце з акцёрамі і іншымі выканаўцамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэжысёр як мысліцель і грамадскі дзеяч, як выразнік, натхняльнік і выхавацель калектыву. Рэжысёр – творчы арганізатар сцэнічнага дзеяння на сцэне, арганізатар канфлікту, барацьбы праз узаемадзеянне акцёраў. Сутворчасць ва ўзаемаадносінах рэжысёра і акцёраў. Вытрымка і цярплівасць рэжысёра ў рабоце з акцёрам. Язык рэжысёрскіх заданняў – дзеянне. Вызначэнне мэты дзеянняў акцёра на шляху да звышзадачы. Станоўчы і адмоўны аспект рэжысёрскага паказу. Заданні дакладныя, лаканічныя, выразныя па форме, верныя. Улік магчымасцей акцёра. Акцёр павінен мець аб'ект увагі на сцэне – партнёр, навакольнае асяроддзе. Пошук жывых акцёрскіх прыстасаванняў. Перашкоды для творчасці акцёра: адсутнасць сканцэнтраванай увагі на аб'екце, як і самога аб'екта, здольнага валодаць увагай, мускульнае напружанне, адсутнасць неабходных сцэнічных апраўданняў. Перспектыва ролі і вобраза. Метад дзейснага аналізу і калектыўна-індывідуальнай творчасці ў рабоце рэжысёра з акцёрам і іншымі выканаўцамі працэсу стварэння нумара. Літаратурны запіс нумара і яго ўвасабленне.

### *Тэма 8. Тэатралізаваныя прадстаўленні і іх асаблівасці. Прынцыпы і прыёмы рэжысуры тэатралізаваных прадстаўленняў*

Я. Б. Вахтангаў аб сучаснасці мастацтва і значнасці гэтага прынцыпу ў рэжысуры тэатралізаваных прадстаўленняў.

Патрабаванні да пастаноўшчыка тэатралізаваных прадстаўленняў. Рэжысура прадстаўленняў як самастойная галіна рэжысёрскага мастацтва. Віды і жанры прадстаўленняў.

Асаблівасці мізансцэны ў тэатралізаваным прадстаўленні. Арганізацыя сцэнічнай прасторы. Законы выканальніцкага майстэрства.

Прынцыпы арганізацыі відовішчнасці прадстаўлення. Улік асаблівасцей аўдыторыі.

Асаблівасці рэжысуры музычна-паэтычнага прадстаўлення. Арганічнае сутыкненне літаратурнага і музычнага матэрыялу. Першаснасць музыкі, падпарадкаванне музычнаму раду бачнага вобраза і пластычнага рашэння прадстаўлення.

Музыка ў запісы і «жывая» музыка. Сцэнічнае рашэнне «жывой музыкі». Неабходнасць стварэння бачнагарада пры выкананні музыкі ў запісе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Відовішчная вобразнасць рэжысёрскага прыёму. Патрабаванне стылявога адзінства літаратурнага тэксту і музыкі.

Асаблівасці трактоўкі вершаванага тэксту і музыкі.

Прыём як спосаб арганізацыі сцэнарна-рэжысёрскага матэрыялу, рэалізацыі сцэнарнага ходу. Характарыстыка прыёмаў парадаксальнай трактоўкі сцэны альбо вобраза, сцэнічнай рэалізацыі метафары, прыём рэфрэна і інш.

Метафарычнасць, асацыятыўнасць, сімвалічнасць рэжысёрскіх прыёмаў пры стварэнні музычна-паэтычнага прадстаўлення.

*Тэма 9. Рэжысёрская задума тэатралізаванага прадстаўлення на аснове створаных студэнтамі нумароў*

Адбор матэрыялу і нумароў для стварэння сцэнарыя тэатралізаванага прадстаўлення. Распрацоўка сюжэтнага ходу сцэнарыя тэатралізаванага прадстаўлення. Мантаж нумароў у блокі і эпізоды з улікам дакладнай звышзадачы.

Кампазіцыя прадстаўлення і яго структура. Пабудова кампазіцыі з улікам зместу і звышзадачы, развіццё канфлікту скразнога дзеяння. Узаемасувязь атмасферы, мізансцэны, тэмпарытму і кампазіцыі. Пабудова кампазіцыі ў адпаведнасці з жанрам. Асаблівасці кампазіцыі музычна-паэтычнага прадстаўлення на аснове бачнагаверша і бачнайпесні, пабудова пралога і эпілога.

Вобразнае рашэнне нумароў, эпізодаў, блокаў. Выбар выразных сродкаў тэатралізаванага прадстаўлення, знаходжанне характару пластычнага рашэння кожнага эпізода прадстаўлення. Дэкаратыўна-мастацкае афармленне, выкарыстанне тэхнічных сродкаў, мастацка-музычнае рашэнне прадстаўлення, вызначэнне касцюмаў дзеючых асоб. Састаўленне мантажнага ліста як спосабу расшыфроўкі кожнага нумара і эпізода тэатралізаванага прадстаўлення. Распрацоўка ў мантажным лісце ўсіх складаемых тэатралізаванага прадстаўлення: зместу дзеяння, назвы нумароў і эпізодаў, вызначэнне і характар музычнага і шумавога афармлення, светлавога рашэння, пералік кінафрагментаў і слайдаў, эскізы касцюмаў, рэквізіту, трансфармацыі афармлення і г. д.

Стварэнне сцэнарыя тэатралізаванага прадстаўлення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 10. Рэжысёрскае ўвасабленне задумы тэатралізаванага прадстаўлення. Работа з акцёрамі і іншымі выканаўцамі. Арганізацыя прагонных, тэхнічных і генеральнай рэпетыцый*

Літаратурны сцэнарый, яго ідэйна-тэматычны аналіз і рэжысёрская задума прадстаўлення.

Распрацоўка пастановачнага плана тэатралізаванага прадстаўлення, канчатковае ўстанаўленне зместу і кампазіцыйнай пабудовы сцэнарыя, яго тэмы, праблемы, звышзадачы, падзейнага рада, канфлікту, скразнога дзеяння, характарыстык вобразаў, сродкаў увасаблення звышзадачы.

Канчатковая дапрацоўка касцюмаў дзеючых асоб, дэкарацый, рэквізіту, музычнага, шумавога, светлавога рашэння тэатралізаванага прадстаўлення. Дапрацоўка і ўвасабленне экспазіцыі і фіналу, пралога і эпілога тэатралізаванага прадстаўлення, канчатковае вызначэнне апорных сэнсавых мізансцэн, аб'яднанне эпізодаў у сувязі з дакладнай звышзадачай прадстаўлення адзіным рэжысёрскім ходам.

Пошук і вызначэнне іншасказальных сродкаў выразнасці для ўвасаблення рэжысёрскай задумы прадстаўлення.

Методыка правядзення рэпетыцый з акцёрамі. Пошук слоўнага дзеяння, пластычнага рашэння вобразаў, аб'яднанне ўсіх выразных сродкаў з дзеяннямі акцёраў усіх удзельнікаў прадстаўлення.

Арганізацыя бягучых і тэхнічных прагонаў тэатралізаванага прадстаўлення адпаведна з распрацаваным графікам рэпетыцый.

Методыка правядзення генеральнай рэпетыцыі. Злучэнне ўсіх элементаў тэатралізаванага прадстаўлення ў адзінае цэлае, праверка агульнай кампазіцыі, рытму нумароў і пераходаў, праверка гатоўнасці пастановачнай часткі, светлавога, музычнага, шумавога і інш. афармлення, канчатковы хронаметраж асобных эпізодаў і ўсяго прадстаўлення. Адпрацоўка кампазіцыйнай пабудовы стройнасці і дакладна пабудаванага кампазіцыйнага малюнка сцэнічнага дзеяння. Аналіз генеральнай рэпетыцыі з удзельнікамі прадстаўлення, характар заўваг рэжысёра. Правядзенне тэатралізаванага прадстаўлення як завяршальны этап. Аналіз і абмеркаванне тэатралізаванага прадстаўлення з улікам успрымання гледачом. Літаратурны запіс тэатралізаванага прадстаўлення і яго ўвасабленне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел 3. Сцэнічная мова

*Тэма 1. Уводзіны. Метадычныя прынцыпы і патрабаванні да выбару навучальна-творчага матэрыялу. Тэарэтычныя асновы пастаноўкі голасу і маўлення*

Тэарэтычныя веды выхавання голасу і мовы. Прыёмы галасамоўнага трэнінгу. Унутраная тэхніка моўнага дзеяння ў мастацтве слова. Выкананне і аналіз прамоў-успамінаў з дзяцінства ў групе. Культура мовы. Ступень авалодання багаццем і выразнымі сродкамі мовы.

*Тэма 2. Патрабаванні да выбару навучальна-творчага матэрыялу. Публіцыстыка як сродак выхавання актыўнай жыццёвай пазіцыі. Мэтавыя ўстаноўкі ў рабоце над творчым матэрыялам. Асаблівасці славеснага дзеяння ў гумарыстычных творах: казках, гумарэсках*

Выбар лідара для псіхалагічнага партрэта. Пошукі мемуарнай літаратуры, эсэ. Абарона свайго героя. Прысваенне сабе яго лепшых якасцей. Стварэнне ўласнай, аўтарскай прозы, дзе героі – блізкія, родныя людзі, сваякі, настаўнікі, сябры. Стварэнне «моўнага альбома», галерэі блізкіх.

Выхаванне пачуцця гумару на байках, казках. Асаблівасці публіцыстыкі і казкі, байкі, іх жанравае інтанацыйнае адрозненне. Разуменне вобразаў, характараў герояў казак, баек у адпаведнасці з задумай аўтара. Выкарыстанне невербальных сродкаў зносін (міміка, жэст). Натуральнае існаванне ў казцы. Развіццё эмацыянальных, вобразных здольнасцей і творчых задаткаў студэнта ў працы над творамі эпічных жанраў (байкі, казкі, легенды, паданні).

*Тэма 3. Элементы знешняй і ўнутранай тэхнікі слоўнага ўздзеяння. Дыханне і голас. Прыёмы галасамоўнага трэнінгу*

Комплекснае засваенне моўных навыкаў. Развіццё фантазіі студэнта. Мэтаазначанае, падрабязнае і паслядоўнае асваенне практыкаванняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 4. Тэхніка мовы, асноўныя практыкаванні і іх неабходнасць для авалодання мастацкім творам. Комплекснае засваенне моўных навыкаў. Развіццё фантазіі студэнта. Мова ў жыцці і на сцэне*

Засваенне прыёмаў комплекснага трэнінгу: рэлаксацыя, гігіенічны і вібрацыйны масаж, дыхальная размінка, унутрыглотачная гімнастыка, артыкуляцыйныя практыкаванні, дыкцыйны трэнінг, галасавыя практыкаванні.

Комплекснае выхаванне моўных якасцей студэнта. Новая тэорыя голасаўтварэння і асноўныя прынцыпы моўнай тэхнікі. Свядомае засваенне студэнтамі элементаў унутранай і знешняй тэхнікі. Мэтавыя ўстаноўкі ў рабоце над тэкстам гульнявых праграм студэнтаў для развіцця іх фантазіі. Развіццё моўнага слыху студэнта. Прыёмы голасу – моўнага трэнінгу. Рэзанатары. Галасавыя рэгістры. Сіла гуку. Размеркаванне гуку на пляцоўцы. Апора гуку. Засваенне правіл арфаэпіі ў галасамоўным трэнінгу. Развіццё моўнага слыху, здольнасць заўважаць памылкі знешняй і ўнутранай тэхнікі. Валоданне тэрміналогіяй.

*Тэма 5. Дыкцыя і арфаэпія ў комплексным засваенні папярэдняга матэрыялу. Артыкуляцыя*

Дыкцыя і арфаэпія ў комплексным засваенні папярэдняга матэрыялу. Развіццё фанацыйнага (дыяфрагмальнага) дыхання, дыкцыйнай выразнасці, валоданне «апорай гуку», свабодай гучання. Вядзенне антыслоўніка. Запісы слоў, гукавы склад якіх парушаецца (выпадзенне галосных, зычных, цэлых складоў). Мэта гэтай працы – развіццё моўнага слыху, дыкцыйнай чысціні. Веданне беларускага і рускага алфавіта (іх адрозненне) і ўвядзенне яго ў гульнявыя практыкаванні.

*Тэма 6. Этапы работы над тэкстам. Мастацкае слова і моўнае дзеянне. Слова і рух. Выразныя сродкі маўлення*

Мастацкае слова і моўнае дзеянне. Слова і рух. Этапы работы над тэкстам. Авалоданне практычнымі прыёмамі развіцця голасу, мовы (моўнаручны рэфлекс, імітацыя, гукаперайманне, мова ў руху). Выхаванне свабоды дыхання і гучання на мяккай атацы голасу. Развіццё дыкцыйнай чысціні культуры маўлення, логікі моўнага дзеяння. Калектыўнае моўнае дзеянне. Складан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не невялікіх апавяданняў (у розных жанрах) з мэтай авалодання размоўнай інтанацыяй, імправізацыі на зададзеную тэму.

*Тэма 7. Выканальніцкі аналіз тэксту:*
*скразное дзеянне, падтэкст*

Выканальніцкі аналіз тэксту: скразное дзеянне, падтэкст. Этапы работы над тэкстам. Аналіз твора (тэма, ідэя, скразное дзеянне, сюжэт, звышзадача, канфлікт). Лагічны аналіз твора, увасабленне тэкстаў. Лагічная перспектыва, падтэкст, паўзы (псіхалагічныя, лагічныя). Уздзеянне словам на слухачоў, гледачоў.

*Тэма 8. Асаблівасці вершаванай мовы. Асноўныя паэтычныя*
*жанры. Асноўныя сістэмы вершаскладання.*
*Прыёмы авалодання паэтычным матэрыялам*

Асаблівасці вершаванай мовы. Асноўныя сістэмы вершаскладання. Метрычная, танічная, сілабатанічная сістэмы вершаскладання. Жанравыя асаблівасці вершаванай мовы (рытм, рыфма, паўза, памер, перанос).

Асноўныя паэтычныя жанры і формы. Прыёмы авалодвання паэтычным матэрыялам (скандзіраванне, рыфмоўкі), адбор вершаў на беларускай і рускай мовах. Асаблівасці аўтарскай мовы розных паэтаў.

*Тэма 9. Выразныя сродкі мовы.*
*Логіка, лагічны націск, моўныя такты і паўзы.*
*Дзейсная прырода знакаў прыпынку ў вершаванай мове*

Выразныя сродкі мовы. Логіка, лагічны націск, моўныя такты і паўзы. Эмацыянальная і тэхнічная выразнасць – асноўныя якасці мовы. Моўныя сродкі ў эмацыянальным уздзеянні на аўдыторыю: інверсія, паўтор, тропы і іх класіфікацыя. Праца над лагічным разборам выбраных урыўкаў (проза, вершы). Выяўленне лагічнага націску, лагічнай паўзы. Знакі прыпынку на пісьме і ў дзейсным слове. Дзейсная прырода знакаў прыпынку ў вершаванай мове. Развіццё творчых здольнасцей студэнтаў на матэрыяле вершаваных твораў. Засваенне навыку моўнага дзеяння ў вершаваных творах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 10. Выхаванне элементаў унутранай тэхнікі моўнага дзеяння (бачанне, уяўленне, адносіны, ацэнка)*

Паэты Пушкінскай пары. Санеты Шэкспіра. Паэты срэбнага веку. Жаночая паэзія. Беларускія класікі і сучасныя паэты. Уласная ацэнка кожнага паэта. Выхаванне элементаў унутранай тэхнікі моўнага дзеяння (бачанне, уяўленне, адносіны, ацэнка). Сродкі збліжэння з выбраным творам. Фантазія студэнта ў выхаванні бачання і ацэнкі твора.

*Тэма 11. Выхаванне звычкі арганічнага жыцця ў выкананні вершаваных твораў. Пазамоўныя сродкі выразнасці (міміка, жэст, пластыка)*

Выхаванне звычкі арганічнага жыцця ў выкананні вершаваных твораў. Пазамоўныя сродкі выразнасці (міміка, жэст, пластыка). Замацаванне навыкаў самастойнай рэжысёрска-выканальніцкай працы над творамі вершаванай формы. Адчуванне твора аўтара як свайго ўласнага. Выхаванне сучаснай грамадзянскай пазіцыі.

*Тэма 12. Прынцыпы работы над ажыццяўленнем створанай кампазіцыі. Размеркаванне на пляцоўцы. Тэмпарытм*

Прынцыпы стварэння кампазіцый: наяўнасць асноўнай тэмы і сэнсу, якія аб’ядноўваюць матэрыял. Кампазіцыя і мантаж. Спосабы стварэння кампазіцыі (храналагічны, кантрасны і інш.). Спалучэнне розных жанраў. Прынцып літаратурнага спектакля і яго адрозненне ад драматычнага. Асоба ў літаратурным спектаклі. Адбор неабходных элементаў для больш яскравага і пераканальнага паказу творчай працы. Законы выканання літаратурных кампазіцый. Прынцыпы работы над ажыццяўляемай кампазіцыяй. Агульнасць дзеяння выканаўцаў. Калектыўнасць моўнага дзеяння. Эстафета ў развіцці дзеяння «жыццё ў музыцы». Слова і мізансцэна. Актыўная мізансцэна. Спосабы зносін выканаўцаў з аўдыторыяй. Выхаванне чулага падыходу да творчай работы, пачуццё партнёра-аднадумца. Размеркаванне на пляцоўцы. Тэмпарытм.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 13. Логіка мовы. Прынцыпы адбору мастацкага твора для выканання прозы. Засваенне логікі мовы на літаратурным матэрыяле: моўныя такты, лагічныя і псіхалагічныя паўзы, лагічны націск, лагічная інтанацыя, мелодыка мовы*

